Источник: "Belarus" - №12, 2024-12-20





# ЧВЭРЦЬ СТАГОДДЗЯ РАЗАМ

**Беларускія вучоныя і парламентарыі падчас круглага стала, прысвечанага 25-годдзю Саюзнай дзяржавы, абмяркавалі праекты і праграмы, якія былі рэалізаваны ў супрацоўніцтве з расійскімі калегамі. Удзельнікі мерапрыемства гаварылі пра дасягненні і перспектывы палітычнага, эканамічнага, сацыяльнага і культурнага развіцця.**



БелТА



Ганна Трошына. Чвэрць стагоддзя разам

Источник: "Belarus" - №12, 2024-12-20



За чвэрць стагоддзя ў рамках саюзных пагадненняў рэалізавана звыш 80 праграм у розных галінах, 22 з іх звязаны з навуковай сферай. Сярод іх – суперкамп'ютары, праекты ў атамнай энергетыцы і касмічнай галіне, IT–тэхналогіі, генная інжынерыя, біятэхналогіі, палярныя даследаванні.

## КРОК У БУДУЧЫНЮ

Як заўважыў перад пачаткам сустрэчы старшыня Прэзідыума НАН Беларусі акадэмік Уладзімір Гусакоў, такое ўзаемадзеянне дазволіла не проста захаваць навуковыя школы, але і развіць іх, многія з распрацовак сталі прарыўнымі.

Падпісанне саюзнага дагавора адкрывала перад навукоўцамі новыя магчымасці. Краіна атрымала доступ да расійскіх рэсурсаў і новага вялікага рынку збыту айчынных тавараў. "У выніку шматбаковай і разнастайнай работы ў Саюзнай дзяржаве, дзякуючы пад'ёму ўнутранай эканомікі, чаму садзейнічаў навуковы прагрэс, стварэнню шэрагу новых прадпрыемстваў, мы змаглі дасягнуць з'яўлення сучаснай суверэннай Беларусі з высокім узроўнем развіцця. Не было б Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы – не было б саюзнага ўзаемадзеяння і інтэграцыі, наўрад ці мы б гэтага дасягнулі", – упэўнены Уладзімір Гусакоў.

Нацыянальная акадэмія навук супрацоўнічае з вядучымі расійскімі навуковымі цэнтрамі і высокатэхналагічнымі карпарацыямі, такімі як Навукова-даследчы цэнтр "Курчатаўскі інстытут", Аб'яднаны інстытут ядзерных даследаванняў (Дубна), Сібірскае і Дальнеўсходняе аддзяленні расійскай акадэміі навук, карпарацыі "Раскосмас" і "Расатам", фонд "Сколкава".

Сёння навука служыць інтарэсам нацыянальных эканомік, вырашае новыя задачы, звязаныя з развіццём пэўных вытворчасцяў, мадэрнізацыяй прадпрыемстваў. Вучоныя ўпэўнены, што ў эпоху лічбавізацыі і штучнага інтэлекту менавіта навука становіцца гарантам прагрэсу, супрацоўніцтва вучоных Беларусі і Расіі. Яна павінна быць добрым стартам для рыўка ў будучыню. Жыццёва неабходна развіваць флагманскія праекты, накіраваныя на імпартазабеспячэнне, нарошчванне канкурэнтаздольнасці эканомік, іх незалежнасць ад знешняй кан'юктуры.

"За час змены аднаго пакалення Саюзная дзяржава стала прыкладам, які не мае аналагаў не толькі на еўразійскай прасторы, але і ў глабальным маштабе. Сінергія двухбаковых узаемаадносін у палітычнай, эканамічнай і сацыяльнай галінах забяспечыла значымыя эфекты па ўсіх актуальных кірунках дзейнасці брацкіх дзяржаў і народаў. Наш саюзны праект на справе даказаў – справядлівасці, равенству, кааперацыі, узаемнай выгадзе няма альтэрнатывы. Для навуковай супольнасці асабліва важна, што менавіта ў Саюзнай дзяржаве акцэнт зроблены на навуку як ключавы фактар устойлівага дынамічнага развіцця".

## АСВАЕННЕ КОСМАСУ

Начальнік упраўлення аэракасмічнай дзейнасці апарата НАН Беларусі акадэмік Пётр Віцязь заўважыў, што разам з 25-годдзем Саюзнай дзяржавы,






Ганна Трошына. Чвэрць стагоддзя разам

Источник: "Belarus" - №12, 2024-12-20



можна адзначаць такі ж юбілей стварэння сумесных касмічных праграм. Ужо ў 1998 годзе бюро Прэзідыума НАН прыняло рашэнне актыўна ўзаемадзейнічаць у рамках Саюзнай дзяржавы. І першым кірункам у супрацоўніцтве з расійскімі вучонымі быў менавіта касмічны. На дадзены час рэалізаваны восем сумесных касмічных праграм, выконваецца дзявятая і ў перспектыве яшчэ дзясятак новых праграм. Палёт Марыі Васілеўскай у космас стаў яшчэ адным штуршком для развіцця касмічнай галіны. З'явіліся новыя кірункі, звязаныя з падрыхтоўкай людзей для засваення космасу і развіццё паслуг для розных галін гаспадаркі, якія звязаны з дасягненнямі ў гэтай галіне.

Дырэктар Інстытута эканомікі Дзяніс Муха расказаў, што тавараабарот дзвюх краін у 2023 годзе дасягнуў гістарычнага максімуму і склаў 53 мільярды долараў. Расія для Беларусі з'яўляецца не толькі асноўным гандлёвым партнёрам, але і ўтрымлівае лідарства па капіталаўкладаннях у эканоміку.

У 2022 годзе былі зацверджаны 28 саюзных праграм, якія выводзяць Расію і Беларусь на прынцыпіяльна новы ўзровень эканамічнай інтэграцыі. Яны датычацца рэальнага сектара эканомікі, найперш энергетыкі, прамысловасці, аграрнай галіны, інфрастуктуры. Разгледжаны макраэканамічныя пытанні, грашова-крэдытная, падатковая палітыка, сацыяльны сектар. У выніку гэтых праграм ужо падрыхтавана каля 400 нарматыўных і заканадаўчых актаў, падпісаны дзясяткі беларуска-расійскіх дагавораў рознага ўзроўню.




Вадзім Лакіза, Ірына Жылінская, Аляксандр Лакотка

## ПРЭЗЕНТАЦЫЯ ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ

Дырэктар Цэнтра сістэмнага аналізу і стратэгічных даследаванняў НАН Валерый Ганчароў адзначыў, што адной з важнейшых складальных з'яўляецца супрацоўніцтва вучоных, у тым ліку па лініі фарміравання адзінай навукова-інавацыйнай прасторы Саюзнай дзяржавы. Гэтаму садзейнічаюць у тым ліку канферэнцыі, форумы, семінары. Арганізацыі акадэміі навук Беларусі ў год праводзяць каля сотні мерапрыемстваў, удзельнікамі і ганаровымі гасцямі якіх з'яўляюцца расійскія калегі. Вучоныя НАН бяруць удзел у дзясятках выставак, якія праводзяцца як на нашай тэрыторыі, так і ў Расійскай Федэрацыі. У гэтым годзе выстаўку "Беларусь інтэлектуальная", што раней праходзіла ў Мінску і рэгіёнах і мела вялікі поспех, было вырашана прадставіць на беларускім павільёне выставачнага крмплекса ВДНГ у Маскве, якая, як заўважыў Валерый Ганчароў, прадэманстравала інтэлект беларускай нацыі: "Мы паказалі ў тэматычных кластарах тыя напрацоўкі, у якіх моцная Рэспубліка Беларусь, у тым ліку з акцэнтам на сумесныя праекты, што дазволілі нарасціць саюзны патэнцыял. Гэта касмічныя тэхналогіі, лазерная тэхніка, мікраэлектронныя кампаненты, серыя распрацовак у галіне хіміі, нафтахіміі, экалогіі, фармацэўтыкі, наш АПК і гуманітарнае развіццё, напрацоўкі ў галіне ідэалагічнага і патрыятычнага выхавання". Вучонымі было арганізавана дзяжурства на выстаўцы, штодзень эксперты знаёмілі з распрацоўкамі, магчымасцямі для супрацоўніцтва і развіцця новых кірункаў. За 2 месяцы, што працаваў беларускі павільён, яго наведала больш 20 дэлегацый высокага ўзроўню.

Валерый Ганчароў звярнуў увагу на тое, што яшчэ на шостым форуме рэгіёнаў, які праходзіў у Санкт-Пецярбургу, разглядалася пытанне стварэння высокахуткаснай магістралі: "Акадэмія навук актыўна ўключылася ў распрацоўку гэтага мегапраекта, мы падключалі і тэхналагічныя веды, і эканамічныя абгрунтаванні нашага ўдзелу ў ім. Для Масквы і Піцера праект ужо ў высокай ступені рэалізаваны, наступным пунктам на карце будзе Мінск".

## АГУЛЬНАЯ ГУМАНІТАРНАЯ ПРАСТОРА

Намеснік дырэктара Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Аляксандр Бараноўскі заўважыў, што палітыка ў галіне культуры накіравана на захаванне агульных каштоўнасцяў, супрацьдзеянне фальсіфікацыі гісторыі, развіццё творчай актыўнасці. У рамках Саюзнай дзяржавы праводзяцца сумесныя фестывалі, сустрэчы дзеячоў мастацтва, гастролі творчых калектываў. Так,



Ганна Трошына. Чвэрць стагоддзя разам

Источник: "Belarus" - №12, 2024-12-20



у праграме Міжнароднага фестывалю мастацтваў “Славянскі базар” у Віцебску праходзяць дні Саюзнай дзяржавы. Актыўна наладжваецца супрацоўніцтва ў музейнай справе, маладзёжнай палітыцы (фестывалі “Моладзь за Саюзную дзяржаву”, “Творчасць юных”), кінематаграфіі. Фільм “Брэсцкая крэпасць” фінансаваўся Пастаянным камітэтам Саюзнай дзяржавы.

Наладжана шчыльнае супрацоўніцтва паміж мовазнаўцамі, у расійскіх рэгіёнах запатрабаваны вопыт беларускіх даследчыкаў, звязаны з лічбавізацыяй моўных скарбаў. Нашы вучоныя працуюць ў архівах Расійскай Федэрацыі з мэтай пошуку і




вяртання пісьмовай спадчыны. Як паведаміў дырэктар Інстытута мовазнаўства Ігар Капылоў, нядаўна ўдалося вярнуць першую беларускую граматыку беларускай мовы (1840 года). Добрыя сувязі ў інстытута з Кастрамскім універсітэтам, у перспектыве развіццё новых праектаў з сібірскім аддзяленнем Расійскай акадэміі навук, у прыватнасці, даследаванне і пераклад на беларускую мову якуцкага гераічнага эпаса як помніка нематэрыяльнай спадчыны чалавецтва. Цікавіць айчынных вучоных і трансфармацыя беларускай фальклорнай традыцыі ў Сібіры, куды у гады Сталыпінскай рэформы перасялілася шмат ураджэнцаў з нашых земляў. Наладжваецца супрацоўніцтва з беларускай дыяспарай.

Дырэктар Інстытута літаратуразнаўства Іван Саверчанка расказаў, што сёння праводзяцца сумесныя даследаванні з расійскім Інстытутам сусветнай літаратуры імя М. Горкага. Таксама ён адзначы праект “Мост сяброўства”, у рамках якога выходзіць альманах з творамі беларускіх і рускіх празаікаў– пачаткоўцаў. Рэгулярна здзяйсняюцца пераклады беларускіх аўтараў на рускую мову, расійскіх – на беларускую.

## СТВАРЭННЕ АБ’ЕКТЫЎНАЙ КАРЦІНЫ МІНУЛАГА

Вучоны сакратар гістарычнага факультэта Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта, кіраўнік лабараторыі “Гісторыя дыяспар і міграцый”, кіраўнік расійскай рабочай групы Экспертна-кансультатыўнага беларуска-расійскага савета па гісторыі Аксана Салопава звярнула ўвагу на працэсы фарміравання адзінай адукацыйнай прасторы: “Відавочна, што нашы краіны дасягнулі поўнага ўзаемаразумення ключавых пытанняў не толькі гуманітарнага развіцця, але і агульных міжпалітычных прыярытэтаў, адзінай пазіцыі ў галіне разумення задач па захаванні гістарычнай памяці, каштоўнасных арыенціраў”.

У 2024 годзе нашы дзяржавы разам святкавалі 80-годдзе вызвалення беларускіх земляў ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, сёння сумесна рыхтуюцца адзначыць 80-годдзе Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Беларускія і расійскія гісторыкі разам працуюць над вучэбнымі дапаможнікамі, выступаюць за тое, каб фіксіраваць аб’ектыўную карціну гістарычнага мінулага і папулярызаваць гэтыя веды. У 2023 годзе быў створаны Экспертна-кансультатыўны расійска-беларускі савет па гісторыі. Ён аб’яднаў 30 вядучых цэнтраў Расіі і Беларусі, дзе выкладаецца і вывучаецца гісторыя. Сярод яго задач – мемарыялізацыя гістарычнай памяці, работа па рэцэнзаванні расійскіх і беларускіх падручнікаў па гісторыі ў мэтах захавання агульнай гістарычнай памяці, збліжэнне навуковых пазіцый пры выкладанні агульнай гісторыі, стварэнне першага расійска-беларускага навуковага часопіса, падрыхтоўка кніг. Таксама Аксана Салопава звярнула ўвагу, што ў абедзвюх краінах расце статус гісторыкаў, разуменне іх высокай адказнасці за вынікі сваёй работы. “Гістарычная навука здольна ствараць і ўмацоўваць дзяржавы”, – заўважыла даследчыца.

Ганна **Трошына**

Фота Алены Дзядзюлі



Ганна Трошына. Чвэрць стагоддзя разам